Приложение

**«Святыні зямлі Стаўбцоўскай»**

Дзераўная – Налібакі – Школьны – Слабодка – Рубяжэвічы – Стоўбцы – Новы Свержань – Вішнявец

Від перамяшчэння: аўтобусна-пешаходны, аўтамабільны.
Від турызму: гісторыка-культурны.
Адлегласць: ~114 км.
Працягласць: ~4-5 гадзін.
*Апісанне маршрута/Анатацыя:*
*Стаўбцоўскі раён знаходзіцца ў цэнтральным рэгіёне Беларусі, тут здаўна пражываюць і праваслаўныя, і каталікі, якія будуюць свае храмы на працягу некалькіх стагоддзяў. Гэтыя храмы адносяцца да розных архітэктурных стыляў, пабудаваны з розных матэрыялаў і з'яўляюцца сапраўдным упрыгажэннем Стаўбцоўшчыны. Маршрут дапаможа пазнаёміцца са старадаўнімі храмамі і мястэчкамі, адчуць веліч і атрымаць асалоду ад прыгажосці святыняў Стаўбцоўскай зямлі.*

**Апісанне маршрута:**

**Прыбыццё ў аг. Дзераўная**, у цэнтры якога размяшчаецца касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі *(53.700740, 26.559266*). Помнік архітэктуры готыкі і рэнесансу. Мураваны храм заснаваны ў 1590 г. (па іншых звестках перабудаваны з кальвінскага збора). У другой палове XVII ст. прыбудавана вежа.


Фота 1.

Пераезд у **аг. Налібакі (~11 км**) (53.758154, 26.470782), дзе знаходзіцца касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Помнік архітэктуры эклектыкі з рысамі мадэрна і неарэнесансу, позняга барока.

У вёсцы, якая дала назву Налібацкай пушчы, драўляны касцёл быў заснаваны яшчэ ў 1447 г. Будаўніцтва цяперашняга касцёла было распачата ў 1935 г., а скончана ў пачатку 1990-х гг. На тэрыторыі ля касцёла знаходзяцца могілкі, побач з самім будынкам размешчаны капліца, званіца, скульптурныя кампазіцыі.

Капліца, размешчаная побач з касцёлам, пабудавана ў канцы XX стагоддзя, з’яўляецца помнікам народнага дойлідства.



Фота 2.

Пераезд у **пас. Школьны (~21 км)**, дзе размешчаны касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса (53.761268, 26.660066). Пабудаваны за 2 км на ўсход ад вёскі Хатава ў 1933 г, на тэрыторыі былой аднайменнай сядзібы Ленскіх. Помнік архітэктуры неараманскага стылю. У канцы 1990 года касцёл быў адбудаваны.



Фота 3.

Пераезд у **в. Слабодка Літвенскага сельсавета (~21 км)** – маленькую вёску, галоўнай славутасцю якой з’яўляецца драўляная **царква Святога Георгія** (53.771641, 26.770838), пабудаваная ў пачатку XX ст. (па іншых звестках у канцы 1880-х гг.).



Фота 4.

Пераезд у **аг. Рубяжэвічы (~13 км)**, дзе можна пабачыць **касцёл Святога Іосіфа** (53.694199, 26.869571), пабудаваны ў 1907–1911 гг. у неагатычным стылі. Касцёл узведзены з часанага каменю.




Фота 5.

Пераезд у **г. Стоўбцы (~31 км)**, раённы цэнтр, дзе ў 1825 г. была пабудавана з цэглы царква Святой Праведнай Ганны (цяпер Кафедральны сабор) (53.478447, 26.730867). Абнесена бутавай агароджай з двух’яруснай брамай-званіцай. Помнік архітэктуры класіцызму з рысамі барока.



Фота 6.

Пераезд у **в. Новы Свержань (~4 км)**, дзе на плошчы ў цэнтры вёскі ўжо больш за 400 гадоў знаходзяцца два храма. **Касцёл Святых Пятра і Паўла** (53.450953, 26.736396) пабудаваны ў 1588 г. (па іншай версіі перароблены з кальвінскага збора). Касцёл уяўляе сабой мураваны прамавугольны ў плане аднавежавы храм у стылі рэнесансу з элементамі готыкі.

Побач з ім і амаль адначасова была заснавана **царква Успення Прасвятой Багародзіцы** (53.451977, 26.736464). Упершыню згадваецца ў 1590 г. Мураваны будынак на месцы драўлянай царквы узведзены ў 1743 г. Храм аднавежавы, у стылі барока.



Фота 7.



Фота 8.

Пераезд у **аг. Вішнявец (да 1964 г. называўся Гавязна) (~13 км)**, дзе знаходзіцца царква Нараджэння Іаана Прадцечы (53.348451, 26.686872), якая была пабудавана ў 1742 годзе і карэнным чынам перабудавана пад праваслаўную пасля скасавання уніі да 1850 года. Помнік архітэктуры барока.

Фота 9. 

1. **Аг. Дзераўная**, Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі XVI ст.

   Шырата: *53.700740,*

   Даўгата: *26.559266*

2. **Аг. Налібакі,** касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі XX ст.

   Шырата: 53.758154,

   Даўгата: 26.470782

3. **Пас. Школьны**, касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса XX ст.

   Шырата: 53.761268,

   Даўгата: 26.660066

4. **В. Слабодка,** царква Святога Георгія XIX в.

   Шырата: 53.771641,

   Даўгата: 26.770838

5. **Аг. Рубяжэвічы,** касцёл Святога Іосіфа XX ст.

   Шырата: 53.694199,

   Даўгата: 26.869571

6. **Г. Стоўбцы,** Кафедральны сабор Святой Праведнай Ганны XIX ст.

   Шырата: 53.478447,

   Даўгата: 26.730867

7. **В. Новы Свержань**, касцёл Святых Пятра і Паўла XVI ст.

Шырата: 53.450953,

Даўгата: 26.736396

8. **В. Новы Свержань**, царква Успення Прасвятой Багародзіцы XVIII ст.

Шырата: 53.451977,

Даўгата: 26.736464

9. **Аг. Вішнявец**, царква Нараджэння Іаана Прадцечы XVIII ст.

Шырата: 53.348451,

Даўгата: 26.686872

*Фота размешчаны на гугл дыску:*

https://drive.google.com/drive/folders/18JaQA12CU93OEb8MCHQuZkA2FwRC8a9N